*Да 300-годдзя з дня нараджэння І. С. Баха*

---

*Аляксандр Карацееў*

# ПЯТНАЦЦАЦЬ СУСТРЭЧ З МАЭСТРА

Вечары арганнай музыкі заўсёды выклікаюць павышаную цікавасць слухачоў. Пачынаючы з XVI стагоддзя, арган атрымаў шырокае распаўсюджанне і заслужаную папулярнасць. Для аргана пісалі многія кампазітары, але мы заўсёды з глыбокай пашанай называем вялікага Іагана Себасцьяна Баха.

У канцэртнай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі з нязменным поспехам быў паказаны унікальны двухгадовы цыкл з 15 канцэртаў «Іаган Себасцьян Бах. Усе творы для аргана». Гэтыя вечары арганнай музыкі былі праведзены арганістам Аляксандрам Фісейскім і музычным каментатарам Цэнтральнага тэлебачання Вольгай Дабрахотавай.

Асаблівасцю арганных канцэртаў, што адбыліся ў Мінску, было тое, што ў іх удала ўвасобілася ідэя стварэння цыкла музычных гутарак пра творчасць І. С. Баха, якія спалучаюць расказ пра кампазітара і выкананне яго твораў. Такая форма правядзення канцэртаў не новая, але часта мы з'яўляемся сведкамі таго, што каментарыі і выкананне ўспрымаюцца адасоблена. Трэба адзначыць, што ў дадзеным арганным цыкле каментарыі музыказнаўца В. Дабрахотавай, якія тлумачылі слухачам старонкі творчасці І. С. Баха, аднаўлялі атмасферу яго часу, знаёмілі з эвалюцыяй аргана, дапаўнялі і ўзбагачалі выступленні А. Фісейскага, спрыялі больш поўнаму раскрыццю характару твораў, зразуменню геніяльных задум кампазітара. Двухгадовы цыкл з 15 канцэртаў быў сапраўдным універсітэтам арганнай музыкі.

Імя Аляксандра Фісейскага добра вядома ў музычным свеце. Дзе б ні выступаў гэты выдатны музыкант, яго канцэрты, якія вызначаюцца разнастайнымі, цікавымі праграмамі, заўсёды маюць поспех. У выкананні А. Фісейскага гучыць арганная музыка Францыі, Германіі, Англіі... Музыкант звяртаецца і да твораў сучасных савецкіх і замежных кампазітараў.

Арганам А. Фісейскі пачаў займацца яшчэ ў музычным вучылішчы пры Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі. Тады ж пачалося і сур'ёзнае вывучэнне ім твораў І. С. Баха, гістарычных матэрыялаў, што дапамагала лепш зразумець змест твораў выдатнага нямецкага кампазітара. Сваю адукацыю музыкант прадоўжыў у Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі ў класах прафесара В. Гарнастаевай (фартэпіяна) і прафесара Л. Ройзмана (арган). Яшчэ студэнтам, у 1973 годзе, А. Фісейскі выступіў з сольным канцэртам у Малой зале кансерваторыі, дзе выканаў Арганную месу І. С. Баха.

Пасля сканчэння кансерваторыі ў 1975 годзе музыкант пачынае самастойную работу ў якасці саліста Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Свой першы канцэрт А. Фісейскі прысвяціў І. С. Баху...

З кожным годам у нас у краіне ўсё больш і больш аматараў арганнай музыкі. Цудоўныя сучасныя інструменты зрабілі даступным выкананне твораў любых эпох і стыляў. Аднак для кожнага арганіста няма нічога больш адказнага, чым выкананне твораў І. С. Баха, гэтага глыбокага мысліцеля, смелага мастака-наватара, натхнёнага і бліскучага імправізатара. На працягу многіх гадоў А. Фісейскі пастаянна выступаў як інтэрпрэтатар бахаўскіх твораў, старанна вывучаў жыццё і творчую спадчыну вялікага нямецкага кампазітара. І таму зварот да аб'ёмнага і буйнамаштабнага цыкла бахаўскіх праграм быў натуральным вынікам дзейнасці музыканта, сведчыў пра яго прафесійную артыстычную сталасць.

Была прачытана савецкая і замежная літаратура, прааналізаваны шматлікія канцэртныя праграмы розных выканаўцаў. Старанна быў вывучаны цыкл канцэртаў з твораў для аргана І. С. Баха, які ў свой час выканаў у Мінску А. Янчанка. У ажыццяўленні грандыёзнай задумы вельмі дапамог поўны каталог твораў І. С. Баха, складзены Вольфгангам Шмідэрам. За паўтара года напружаных рэпетыцый выканаўца правёў карпатлівую работу па складанню праграм асобных канцэртаў. Спачатку меркавалася ўвесь цыкл пабудаваць па прынцыпу жанравай прыналежнасці, паколькі ў канцэртным сезоне 1978—1979 гадоў А. Фісейскі выканаў асобныя праграмы, якія ўключалі ўсе пяць такат, усе шэсць трыо-санат, шэсць вялікіх прэлюдый і фуг лейпцыгскага перыяду жыцця кампазітара. Але ў творчых пошуках, пасля шматразовых выкананняў на рэпетыцыях, усё ж была знойдзена новая кампазіцыя цыкла, якая дазволіла пабудаваць праграму кожнага канцэрта паводле адметных сюжэтаў і драматургіі, захаваць у вядомай меры прынцып храналогіі, больш поўна раскрыць важнасць і значнасць кожнага твора. Асаблівая роля ў цыкле адводзілася харальным апрацоўкам — аснове музычнай мовы І. С. Баха. Стрыжнямі ўсёй работы выступілі закончаныя цыклы харалаў: Арганная кніжачка, Арганная меса, 18 вялікіх харальных фантазій. Творы І. С. Баха гучалі ў прыцемку; прыглушанае мяккае святло выхоплівала толькі постаць выканаўцы і пульт аргана. Калі ж музыка сціхала, блакітны прамень высвятляў музыказнаўцу, і пачынаў гучаць яе мяккі, даверлівы голас... Спакойная манера В. Дабрахотавай, яе здзіўляючая здольнасць цікава як для простых аматараў музычнага мастацтва, так і для прафесіяналаў выкладаць багаты гістарычны і музыказнаўчы матэрыял, уменне сваім эмацыянальным расказам прымусіць літаральна кожнага зазірнуць у свой унутраны свет, безумоўна, памаглі больш глыбокаму ўспрыняццю музыкі І. С. Баха.

Першы ж канцэрт пацвердзіў, што такі цыкл арганных вечароў апраўдае сябе і ўпрыгожыць канцэртныя сезоны філармоніі.

Два выканаўцы цыкла, А. Фісейскі і В. Дабрахотава, паказалі высокае, сапраўднае майстэрства. Першы канцэрт зрабіўся своеасаблівым экскурсам у арганную творчасць І. С. Баха. Характэрнай рысай яго было кантраснае кампазіцыйнае вырашэнне праграмы, якая ахоплівала шматжанравыя творы, напісаныя кампазітарам у розныя перыяды жыцця. Яскрава былі выкананы А. Фісейскім дзесяць харальных апрацовак. Кожная з іх атрымала сваё аблічча, якое вызначылася індывідуальнасцю, дакладным раскрыццём характару і зместу, кампазіцыйна-драматургічным рашэннем. Сярод іх асабліва запомніліся строгі чатырохгалосны харал, пастараль, няхітры дуэт, напісаны ў стылістыцы народнай песні. Міжволі прыгадваліся словы Альберта Швейцара: «Не ведаючы сэнсу матыву, часта немагчыма выканаць п'есу Баха ў правільным тэмпе, з правільнымі акцэнтамі і фразіроўкай». Глыбокае вывучэнне гэтых твораў, сумесны з В. Дабрахотавай роздум дазволілі А. Фісейскаму выканаць іх на высокім узроўні.

Некалькі слоў пра іншыя канцэртныя праграмы, якія таксама мелі свае асаблівасці. Так, напрыклад, у другім канцэрце адбылося свядомае адступленне ад харальнай лініі. У канцэрце прагучалі Трыо-саната до мінор, Прэлюдыя і фуга соль мажор, Фантазія і фуга соль мінор і Восем маленькіх прэлюдый і фуг. Такое рашэнне тлумачыцца тым, што дадзены канцэрт быў задуманы як уступ да тэмы наступнага складанага канцэрта і з'явіўся лагічным працягам агульнай кампазіцыі цыкла.

На трэцім канцэрце, у якім быў паспяхова выкананы унікальны твор — Арганная кніжачка, трэба спыніцца больш падрабязна. Задуманы ён быў І. С. Бахам як твор, прысвечаны святам царкоўнага года. Музыка Арганнай кніжачкі праграмная і непарыўна звязана з тэкстам. Значнасць гэтага на дзіва тонкага і хвалюючага твора вельмі дакладна вызначыў Альберт Швейцар, які назваў яго «слоўнікам музычнай мовы Баха». У невялікіх 45 харальных апрацоўках, вельмі ёмістых, цэласных па вобразах, Бахам старанна распрацаваны матывы, якімі ён канкрэтна перадае змест тэксту. Трэба адзначыць, што гэтыя матывы ў далейшым перайшлі ў многія арганныя, ды і не толькі арганныя творы геніяльнага кампазітара. Таму для слухачоў канцэрт «Арганная кніжачка», які з'явіўся адным з кульмінацыйных момантаў цыкла, у многім садзейнічаў больш глыбокаму ўспрыняццю бахаўскіх твораў. Ад А. Фісейскага гэты канцэрт запатрабаваў не толькі велізарных эмацыянальных выдаткаў, але і высокай выканаўчай тэхнікі. Удала знойдзеная выканаўцам рэгістроўка дакладна адпавядала зместу тэксту і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

характарам твораў. У харале «Такі радасны дзень» А. Фісейскі перадаў урачыстую прыўзнятасць, радасць, паўнату шчасця. У мініяцюры «Стары год прайшоў» узнікае стан лірычнага тамлення, светлага суму, а ў харале «Ах, як нікчэмна, як мімалётна» адчуваецца філасофскі роздум пра веліч жыцця.

У чацвёртым канцэрце звярнула на сябе ўвагу шматжанравасць праграмы. Тут слухачы ўпершыню пазнаёміліся з такатай (Таката і фуга фа мажор), канцэртам-фантазіяй (Вівальдзі — Бах, Канцэрт ля мінор). Цікавая была праграма шостага канцэрта, у якім прагучалі творы на тэмы двух італьянскіх кампазітараў — Фуга сі мінор на тэму А. Карэлі і Двайная фуга до мінор на тэму Д. Легрэнці. Такая кампаноўка твораў дазволіла музыказнаўцу В. Дабрахотавай у сваім выступленні правесці паралелі з творчасцю сучаснікаў І. С. Баха.

Асаблівую цікавасць у слухачоў выклікала праграма восьмага канцэрта — Арганная меса, якая з'яўляецца самым грандыёзным па маштабах і па задуме творам сусветнай арганнай літаратуры. Перад выканаўцам стаяла складаная задача — перадаць бахаўскае, глыбока асабістае бачанне свету. Велічна прагучалі Прэлюдыя і фуга мі-бемоль мажор, вобразна былі выкананы Чатыры дуэты для клавесіна. Кожная з 21 харальных апрацовак мела пэўную рэгістроўку, сціплыя сродкі выразнасці якой акцэнтавалі ўвагу на змесце, садзейнічалі паглыбленаму ўспрыняццю слухачамі філасофскай канцэпцыі кампазітара. Харальныя апрацоўкі, якія выкладаліся часам у манеры паўночнанямецкай арганнай школы, у велічным стылі Пахельбеля, у трыо-санатнай фактуры запатрабавалі ад музыканта выкарыстання ўсіх відаў выканаўчай тэхнікі, у тым ліку і найскладанейшага прыёму двайной педалі.

Нельга не адзначыць і дзесяты канцэрт, які адкрыў другі год цыкла. Удала прагучала на ім Прэлюдыя і фуга сі мінор, якая вызначаецца манументальнасцю гучання. Цудоўна была выканана і Трыо-саната до мажор — лепшы з 6 твораў гэтага жанру. Асаблівае ўражанне ў гэтым творы пакінулі цяжкія для выканання віртуозныя I і III часткі, узвышана і высакародна прагучала II частка. А на адзінаццатым канцэрце слухачы пазнаёміліся з Шасцю шублераўскімі харaламі, якія з'яўляюцца апрацоўкамі для аргана фрагментаў кантат кампазітара. У гэтых апрацоўках вельмі выразна адчуваецца аркестравы стыль, непасрэднасць паказу вобразаў. Цікавасць выклікала п'еса Pedalexercitium. Кампазітар напісаў гэты твор спецыяльна для педалі сола. У гэтай жывой, дынамічнай п'есе выканаўца пераканаўча ўвасобіў задумы кампазітара.

У апошнія канцэрты цыкла ўвайшлі пераважна светлыя і радасныя па вобразах творы. Так, у праграме трынаццатага канцэрта трэба адзначыць віртуознае выкананне Прэлюдыі і фугі рэ мажор, Такаты до мажор і натхнёнае выкананне Фугі з Магніфіката. Удалай была інтэрпрэтацыя Канцэрта соль мажор (14-ы канцэрт цыкла). Лёгкасць, прыгажосць, светлая рэгістрава-тэмбравая палітра фарбаў, магутная фактура скарылі слухачоў у Фантазіі соль мажор — адным з ранніх твораў кампазітара.

Апошні, пятнаццаты канцэрт цыкла быў прысвечаны 18 вялікім харальным фантазіям — твору, напісанаму ў апошнія гады жыцця І. С. Баха.

На гэтым скончыўся цыкл бахаўскіх праграм, які патрабаваў ад дуэта выканаўцаў — А. Фісейскага і В. Дабрахотавай — велізарнага напружання. Адзначаючы значэнне цыкла ў культурным жыцці Беларусі і краіны ў цэлым, яго поўны поспех, красамоўным сведчаннем якога былі сталыя аншлагі, гарачы прыём слухачоў, хочацца выказаць словы ўдзячнасці артыстам за высокае выканаўчае майстэрства, беражлівыя адносіны да бахаўскай спадчыны, самаадданую працу па ўвасабленню ў жыццё сапраўды грандыёзнай, унікальнай задумы. Усім жадаючым, вядома, немагчыма было трапіць на гэтыя канцэрты, і таму фірма «Мелодыя» пачала выпуск серыі пласцінак «І. С. Бах. Творы для аргана».

Напружаная і натхнёная работа А. Фісейскага над бахаўскім цыклам значна ўзбагаціла яго як музыканта, павысіла выканаўчае майстэрства, дапамагла адкрыць каштоўныя мастацкія далягляды, што дало новыя імпульсы творчай актыўнасці выканаўцы. У маі 1983 года А. Фісейскі паспяхова гастраляваў у ЧССР, удзельнічаў у папулярным прадстаўнічым міжнародным фестывалі «Пражская вясна-83», дзе выступіў з вялікім сімфанічным аркестрам Цэнтральнага тэлебачання і Усесаюзнага радыё пад кіраўніцтвам У. Федасеева. Паспяхова працягвае выканаўца гастраляваць па рэспубліцы, выступаючы з канцэртамі клавесіннай музыкі. У яго канцэртных праграмах гучаць творы І. С. Баха, Г. Пёрсела, Ж. Б. Люлі, Ф. Куперэна, Ж. Ф. Дандрыё і інш. Самым характэрным, аднак, з'яўляецца тое, што пасля такога унікальнага бахаўскага цыкла, не спыняючы актыўнай канцэртнай дзейнасці, А. Фісейскі задумаў і падрыхтаваў новы, разлічаны на тры гады цыкл «Анталогія арганнай музыкі». Асноўная яго ідэя — паказ на прыкладах музычных твораў розных эпох магчымасцей аргана і ролі гэтага інструмента ў музычнай культуры. Характэрнай асаблівасцю цыкла з'яўляецца тое, што арган тут прадстаўлены ў больш шырокім амплуа: як сольны інструмент, як удзельнік ансамбляў (санаты Моцарта для дзвюх скрыпак і баса-канцініо), як суправаджаючы інструмент у вакальных творах вядомых майстроў Сярэдневякоўя, Адраджэння. Арган будзе гучаць з камерным і сімфанічным аркестрамі ў канцэртах Г. Гендэля, Й. Гайдна, П. Хіндэміта, Ф. Пуленка, Б. Чайкоўскага...

У гэтым цыкле значнае месца зоймуць творы І. С. Баха. Слухачы атрымаюць унікальную магчымасць пераканацца ў той велізарнай ролі, якую адыгралі яго неўміручыя шэдэўры ў гісторыі музычнай культуры, і адчуць рэальны ўплыў творчасці І. С. Баха на работы кампазітараў розных краін.

...Свет бахаўскай музыкі велізарны, бязмежны. Кожнае наступнае пакаленне будзе пазнаваць і раскрываць яго нанава, здзіўляючыся яго багаццю і прыгажосці.

Фота з асабістага архіва аўтара






Аляксандр Фісейскі.



Вольга Дабрахотава.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ













Калодзеж у Браславе.

Веснічкі. Вёска Асінгарадок Пастаўскага раёна.

Абарог у в. Палотніца Слонімскага раёна.

Азярод і калодзеж у вёсцы Забродздзе Вілейскага раёна.

Калодзеж. Вёска Новая Слабодка Клічаўскага раёна.

Хата і пляцень. Вёска Любна Карэліцкага раёна.